АБ КАЛЕКТЫЎНЫМ КІРАЎНІЦТВЕ І ПЕРСАНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

Ц. КІСЯЛЁЎ
Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР

□

ВЯДОМА, якое велізарнае значэнне надаваў У. І. Ленін арганізацыі работы дзяржаўнага апарату. «Машына савецкай адміністрацыі, — пісаў ён, — павінна працаваць акуратна, сумленна, хутка. Ад яе расхлябанасці не толькі церпяць інтарэсы прыватных асоб, але і ўся справа кіравання набывае характар уяўны, падманлівы. У гэтых ленінскіх словах выразна выказаны высокае прызначэнне і абавязкі савецкіх служачых.

Партыя праяўляе пастаянныя клопаты аб умацаванні і ўдасканальванні дзяржаўнага апарату, дабіваецца, каб усе яго звенні працавалі зладжана і арганізавана, былі цесна звязаны з народам. Стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма і на гэтай аснове павышэнне дабрабыту працоўных, найбольш поўнае задавальненне іх бытавых патрэб і культурных запатрабаванняў, умацаванне магутнасці сацыялістычнай Айчыны — гэтаму падначалена ўся шматгранная дзейнасць Савецкай дзяржавы. Гэта задача будзе выконвацца паспяхова, калі зладжана будуць працаваць кожная ўстанова, кожны служачы.

Культ асобы адмоўна адбіўся на дзейнасці савецкіх устаноў. Зразумела, з норавамі тых часоў скончана. Партыя няўхільна ажыццяўляе ленінскія прынцыпы і нормы партыйнага і дзяржаўнага жыцця. Пра гэта яскрава сведчаць рашэнні лістападаўскага Пленума ЦК КПСС, які прыняў рашэнне аб аднаўленні адзіных краявых, аласных партыйных і савецкіх арганізацый.

Жыццё не пацвердзіла мэтазгоднасці перабудовы партыйных і савецкіх арганізацый па так званаму вытворчаму прынцыпу. Рэформа, як вядома, была праведзена без строгага навуковага падыходу, у атмасферы неапраўданай паспешлівасці. У выніку савецкія органы аказаліся раз'яднанымі, іх роля ў гаспадарчым будаўніцтве была прыніжана, раённае звяно значна аслаблена, ускладнілася абслугоўванне насельніцтва.

Лістападаўскі Пленум ЦК КПСС асабліва падкрэсліў непахіснасць важнейшага ленінскага прынцыпу— калектыўнасці кіраўніцтва. Гэта і зразумела, таму што ніякія, нават самыя выдатныя, адзіночкі не ў сілах замяніць розум, мудрасць, веды і вопыт цэлага калектыву. У той жа час Камуністычная партыя заклікае развіваць ва ўсіх работнікаў, у тым ліку у савецкіх служачых, ініцыятыву і самастойнасць у рабоце, падкрэслівае важнасць персанальнай адказнасці за выкананне прынятых рашэнняў.

Партыйныя арганізацыі рэспублікі імкнуцца да таго, каб пастаянна ўдасканальваць стыль і метады работы апарату савецкага і гаспадарчага кіравання. Мы імкнёмся, каб нашымі ўстановамі кіравалі людзі кваліфікаваныя, з развітым пачуццём новага, ініцыятыўныя, здольныя на пошук гэтага новага. Ініцыятыва, дзелавітасць, я сказаў бы, унутраная падцягнутасць — вось што павінна быць характэрна для савецкага служачага.

Нямала добрага можна сказаць пра савецкіх работнікаў Мінскай вобласці. Выканкомы Саветаў імкнуцца шырока прыцягваць грамадскасць да вырашэння пытанняў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, дзейнічаюць правільна, смела і прынцыпова, не баяцца самастойнасці і адказнасці.

З мінулага года ў кожным раёне пры шырокім удзеле насельніцтва распрацоўваюцца планы культурна-бытавога будаўніцтва. Застрэльшчыкамі пачыну паўсюды выступілі, як правіла, работнікі выканкомаў раённых і сельскіх Саветаў, праявіўшы пры гэтым шмат вынаходлівасці і добрай выдумкі. Такія планы ўносяць мэтанакіраванасць у работу выканкомаў. Яны садзейнічаюць і таннікаў, сельскай інтэлігенцыі, а таксама школьных будынкаў, лазняў, калодзежаў, водакалонак, праведзены значныя работы па добраўпарадкаванню населеных пунктаў.

Кожнае важнае пачынанне, якое нараджаецца на месцах, знаходзіць падтрымку з боку сельскага аблвыканкома. Адчуваючы гэта, служачыя розных устаноў набываюць больш упэўненасці, смялей бяруцца за справы.

На жаль, такая пахвальная ініцыятыва не ўсюды б'е праз край. У прыватнасці, я маю на ўвазе работнікаў выканкома Мінскага гарадскога Савета, занятых у сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва. Абмеркаванне на Савеце Міністраў рэспублікі справаздачы гарвыканкома паказала: хоць выканком зрабіў шмат для паляпшэння бытавога абслугоўвання насельніцтва, аднак патрэбнасці гараджан у многіх відах паслуг далёка не задавальняюцца, якасць і культура абслугоўвання быту вымушаюць дадаць шмат лепшага. У радзе месцаў пасклі работы майстэрань нязручны для насельніцтва. Размяшчэнне сеткі прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання не заўсёды ўдалае. Не цалкам выкарыстоўваюцца сродкі на будаўніцтва новых прадпрыемстваў. Усе гэтыя і многія іншыя пытанні выклікаюць зняжаць ад работнікаў, на якіх усклад дзена абслугоўванне насельніцтва. Калі б яны праяўлялі больш вынаходлівасці і дасціпнасці, а галоўнае— энергіі і настойлівасці, і ўсё выглядала б значна лепш.

Там-сям да гэтага часу прыхільнасць да папер, канцылярскі стыль у горшым значэнні гэтага слова перашкаджаюць па-сапраўднаму наладзіць работу ўстаноў. Нярэдка даводзіцца сустракацца з фактамі раўнадушных адносін да справы. Іншы служачы палец аб палец не стукне, каб самому вырашыць пытанне, але затое з зайздроснай энергіяй дабіваецца ад вышэйстаячага органа пісьмовага ўказання. Мэта тут ставіцца адна: застрахаваць сябе на ўсякі выпадак ад магчымых непрыемнасцей, перакласці адказнасць на іншых.

Нядаўна Міністэрства аховы здароўя ўнесла на абмеркаванне ўрада рэспублікі праект пастановы аб [illegible] медыцынскіх устаноў. Здавалася, [illegible] работнікі міністэрства дзейнічаюць [illegible]рыльна, таму [illegible] дзяржаўнай сродкі [illegible]воймаліся нездаволеныя [illegible]рміны ўводу [illegible] аб'ектаў [illegible]рывалі. Але [illegible] і [illegible] шт[illegible] заклапочанасці [illegible] з міністэрства [illegible] не [illegible] інтэрэсы [illegible] як пастрахоўка. Для [illegible] важна прыняць пастанову, [illegible] патрэбы, таму што па сутнасці ўсе пытанні, якія патрабуюць [illegible] ўрада рэспублікі, [illegible]

(Заканчэнне на 2-й стар.).

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ